*Хто ў 16 год не рэвалюцыянэр, таму ў 30 год ня хопіць адвагі, каб быць кіраўніком пажарнай каманды.*
***Андрэ Маруа.***

навіны MASTY.BY

**ЯНЫ хочуць - МЫ можам!!! МФ**

**№ 2 красавік 2004 г.**

*Маладзёвы бюлетэнь Мастоўшчыны*

# 86 - я ўгодкі БНР

## Памяці сапраўднай грамадзянкі БНР

**25 сакавіка прадстаўнікі мастоўскай інтэлігенцыі і моладзі наведалі Зэльву, дзе ўсклалі кветкі да магілы Ларысы Геніюш да помніка паэткі ля царквы.**

На магіле Ларысы Геніюш моладзь прачытала яе вершы, прадстаўнікі інтэлігенцыі г.Масты запалілі памінальныя сьвечкі, да надгробнай пліты былі ўскладзены ружы. Пасьля дэлегацыя накіравалася да помніка беларускай паэткі каля праваслаўнай царквы ў Зэльве. Да помніка таксама былі ўскладзены ружы. "У дзень заснаваньня Беларускай Народнай Рэспублікі, мы памінаем слаўную дачку беларускага народа Ларысу Геніюш, якая ўсё жыццё была грамадзянкай БНР і ніколі не прыняла Савецкага грамадзянства, нават прайшоўшы праз ГУЛАГ. Імя спадарыні Ларысы ўпісана ў гісторыю Беларусі залатымі літарамі" паведаміў **masty.by** 21 гадовы дэпутат Мастоўскага райсавета дэпутатаў Аляксандр Зарэмбюк.

*З.К.*

## СЬВЯТКАВАНЬНЕ ДНЯ ВОЛІ

**28 сакавіка прадстаўнікі Мастоўскай грамадзкасьці і інтэлігенцыі ўрачыста адзначылі 86 - ю гадавіну ўтварэньня Беларускае Народнае Рэспублікі.**

**На беразе Нёмана ва ўрочышчы "Міхайлоўка" былі арганізаваны літаратурныя чытаньні ды шашлык з бярозавым сокам.**

*Працяг на старонцы 2*

**Навошта беларусам ідэалёгія, альбо параўнай свой заробак** *Старонка 3*

**Маё мястэчка - кут мой родны** *Старонка 3*

**Беларускі музычны партал Слыхавы апарат** *Старонка 2*

**Гіт-Парад Тузіна Гітоў з 10.03.2004 па 23.03.2004** *Старонка 2*

**АБВЕСТКА**

Запрашаем мастоўскую моладзь да супрацы ў нашым маладзёвым бюлетэні. Асноўнае патрабаваньне да аўтараў любоў да нашай Бацькаўшчыны. Далучайся! Цікавыя падарожжы, шчырая кампанія аднадумцаў, працу й адпачынак мы гарантуем! Аўтары лепшых артыкулаў будуць узнагароджаны каштоўнымі прызамі.

***e-mail: paniamonnie@tut.by***

***Беларуская прэса розных гадоў.***

***Наша ніва", 1914 год:***
"Калі першы раз з грудзей беларуса-мужыка вырваўся кліч: "Жыве Беларусь!", у ім зліліся ў вадно і пачуцьцё свайго нацыянальнага я, і прабудзіўшаяся сьведамасьць, што ён чэлавек, роўны ўсім іншым, і захованае ў таемнай глыбіне душы жаданьне волі і зямлі. Усе думкі яго былі аб вызваленьні з нядолі, пагарды людзкой, с цемнаты. Вызваліўшаяся з адвечных путоў душа беларуса жадала скінуць путы і с цела… Вось чаму беларускі рух зразу жэ стаўся рухам дэмократычным: ён абыймаў усё жыцьцё працоўнага беларускаго народу ва ўсіх яго праявах".

***"Звязда", 1964 год. Прафэсар І.Лушчыцкі піша да 100-годзьдзя з дня сьмерці К.Каліноўскага:***
"Каліноўскі як рэвалюцыянэр і мысьліцель сфармаваўся пад уплывам тагачаснага грамадзкага жыцьця, пад магутным ідэйным уплывам рускіх рэвалюцыйных дэмакратаў. Таму яго ідэі, уся рэвалюцыйная практыка інтэрнацыянальныя па свайму духу, агульначалавечыя па свайму зьместу, адначасова яны глыбока нацыянальныя па сваёй форме… Рэвалюцыйна-дэмакратычныя традыцыі, якія ўсталёўваліся змагаром, трывала ўвайшлі ў ідэйную спадчыну савецкіх людзей, што будуюць камунізм".

**КРЫЖаванка ПА ТВАІХ ВЕДАХ**

**Правер прызначэньне той часткі цела, у якую ты закідваеш ежу. Можа яна яшчэ на што здатная?**

*Старонка 4*

# СЬВЯТКАВАНЬНЕ ДНЯ ВОЛІ

У імрэзе ўзялі ўдзел каля 30 чалавек, прысутнічалі госьці з Менску ды Горадні.

Сярод удзельнікаў быў пісьменьнік, аўтар 5 кнігаў Лявон Вашко, дэпутат Мастоўскага райсавета Аляксандр Зарэмбюк, настаўнік, перакладчык Уладзімер Каўшовік, філёляг, экс-дырэктар музэя "Лес і чалавек" Лявон Барташ, журналістка "Газеты Слонімскай" Ірына Лойка. Зь Менску прыехалі кіраўнік Моладзевага інфармацыйнага цэнтра Зьміцер Гаўрусік ды бізнэсовец Усевалад Сіняк. Падчас імрэзы былі ўзгаданы факты ўтварэньня БНР, прачытаны вершы Натальлі Арсеньневай, Уладзімера Жылкі, Ларысы Генiюш, Янкі Купалы, Ніла Гілевіча, Кандрата Крапівы.

*Мікола Змагарэвіч*

## 10-ы тур галасаваньня. 10.03-23.04.2004

1. **Вольскі Лявон.** Калі ідуць на абардаж (Павешаным 1863)
2. **Апотом.** Песьня сапраўднага каўбоя
3. **B:N:**. Толькі я
4. **WZ-Orkiestra**. Я ішоў да цябе
5. **N.R.M..** Рок-н-рол не ўратуе
6. **Сьцяна.** Першы гук
7. **Памідораў**. Дзень без гарэлкі
8. **Стары Ольса.** У Карчме
9. **Garadzkija.** Сам на сам
10. **Deadmarsh.** Па-над белым пухам
11. **Аляксандра і Канстанцін.** My Galileo
12. **Юр`я.** А ў лузі

# Беларускі музычны партал
# СЛЫХАВЫ АПАРАТ

**www.slyhap.com** - музычны партал. Умоўна падзяляецца на 3 часткі: інфармацыйную, камэрцыйную ды дадатковую. У інфармацыйнай частцы можна знайсьці навіны, інтэрвью, музычную афішу, форум, чат, гасьцёўню, конкурсы, фотагалерэю, спасылкі, а таксама скачаць МР3 (хоць сьпіс і невялікі ў параўнаньні з Тузінам Гітоў). У камэрцыйнай частцы можна прыгледзець і набыць кружэлку ( 21 найменьне) па коштах ад 5400 руб да 10500 руб., альбо выставіць свае рэчы на кірмаш-аўкцыён. Таксама там жа прапануюцца паслугі па вэб-дызайну, флэш-анімацыі, рэкляме на сайце і г.д. Дадатковая частка ўключае ў сябе кошык, дзе робіцца замова, мапу сайта, зваротную сувязь з сэрфэрам, інфармацыю па стваральніках сайта і дапамогу. Ёсьць на сайце й досыць цікавыя апытаньні, накшталт, на канцэрт якога гурта ты пайшоў бы ў Амэрыцы, альбо хто на вашую думку павінен паехаць на Эўрабачаньне. Досыць цікавы і адзін з найбуйнейшых беларускіх музычных парталаў.




## АФІША MUSIC

*11 красавіка* ў к/з "Менск" пройдзе канцэрт культавага сумеснага музычнага праэкта "НАРОДНЫ АЛЬБОМ" з удзелам музыкаў гуртоў N.R.M., KRIWI, А. ПАМІДОРАВА, К.КАМОЦКАЙ, З.ВАЙЦЮШКЕВІЧА і інш. Пачатак а 19:00. Кошт квітка ад 8 000 да 25 000. Кожны набыўшы квіток за 25 000 атрымае ў падарунак фірмовую майку з лягатыпам NARODNY ALBOM. Кожнаму ў падарунак вялікоднае яйка!

# РОК-Н-РОЛ - FOREVER

"Тузін Гітоў" і "БМА-груп" зладжваюць сумесную акцыю "Абяры Гэнэралаў" 25 красавіка беларускія рокеры зьбяруцца ў Лядовым палацы ў Менску па вул. Прытыцкага, 27 (Ст.м.Пушкінская). Мяркуецца, што гэта будзе самая буйная рок-акцыя апошніх год, якая працягнецца 4 гадзіны й будзе складацца з дзьвюх частак: Частка 1: выступаюць 5 маладых беларускіх гуртоў. Хто менавіта - выбіраюць наведвальнікі "Тузіна гітоў". З 12 сакавіка па 1 красавіка 2004 на сайце www.music.fromby.net наладжаны адбор прэтэндэнтаў праз галасаваньне. Прэтэндэнты на выступ: Partyzone, B:N:, Deadmarsh, Impatt, IQ-48, Сьцяна, J_Морс, Zygimont Vaza, Garadzkija, Indigo, Крок, Куклы, Тэзаўрус, Склеп, Znich, Siver, Бездна. (на 2004/03/31 вядуць - B:N: (11%), Тэзаўрус (11%), Garadzkija (10%), Silver (10%), Partyzone (10%), Сьцяна (10%). Частка 2: выступаюць самыя гэнэралы айчыннага року.Паводле інфармацыі прадстаўленай на сайце "Тузін Гітоў" выступяць N.R.M., НЕЙРО ДЮБЕЛЬ, КРАМА, ULIS, ZET. Магчымы таксама ўдзел URIA, МЯСЦОВАГА ЧАСУ і БОНДЫ. Усе песьні гэнэралаў будуць выдадзены адной кружэлкай пад аднайменным назовам.

*Падрыхтаваў ZK*

Нашыя новыя аўтаркі

# Маё мястэчка - кут мой родны...

Мястэчка, якое з цягам часу атрымала статус горада, вабіць сваёй прыгажосьцю і па сёньняшні дзень. Сама Спадарыня-Прырода паклапацілася аб тым, каб гэты куточак быў марай кожнага. Выйшаў з хаты -- і адразу: дзіцячыя садкі, школы, свая раённая больніца. Для прыхільнікаў духоўнай прыгажосьці ёсць музэй, музычная школа, Раённы Дом культуры і Раённы Цэнтар выхаваўчай працы, кінатэатар і царква побач з касцёлам . Аматары спорту могуць завітаць у басэйн, на стадыён ці ў спартовы комплекс. У Мастох ёсць свае сацыяльныя службы, аўта- і чыгуначныя станцыі, хлебазавод, дрэваапрацоўчы завод. Колькі памятных мясцін! А прырода: парк, дэндрапарк, лес і рака Нёман – усе ўмовы для адпачынку. Любы раённы цэнтар пазайздросьціць! Здаецца толькі жыві, баў час у асалодзе, але... не. Усё часцей з вуснаў моладзі пачуеш:



“Хутчэй бы зьехаць з гэтае ямы!”. Амаль кожны знойдзе прычыну, па якой ён хацеў бы пакінуць гэтыя мясціны. І толькі адзінкі здольны прызнаць, што “прычына” ў іх самых. Гэта й абыякавасьць, раўнадушша, песымізм пад час разважаньняў пра Мастоўшчыну. Менавіта дзякуючы гэтаму, мы ўжо згубілі такі архітэктурны помнік, як стары будынак Дома культуры. А да скульптуры “Маці з дзіцяці” ўжо даўно сур'ёзна ніхто ня ставіцца, хоць і шмат каму яна падабаецца! Людзей, якія сапраўды імкнуцца зьмяніць жыццё тут у лепшы бок, можна па пальцах пералічыць. Яны прыкладваюць усе сілы й намаганьні, каб назва “Масты” не параўноўвалася зь “ямай”. Было б добра, каб нашыя дзеці й унукі ганарыліся тым, што мы здолелі захаваць тое, перад чым у адказе...

***Пані ЛЯЛЯ***

Гісторыя

# КРОНІКА МАСТОЎШЧЫНЫ

***10 тыс г. да н. э.*** -- на тэрыторыі сучаснага раёна зьявіліся першыя пасяленьні.

***4 тыс г. да н. э. -*** помнікі Нёманскай неалітычнай культуры на Мастоўшчыне.

***4-3 тыс г. да н. э.*** - існаваньне стаянак на берагох р. Зяльвянка каля в. Пескі.

***2-я палова І тысячагоддзя да н. э. -*** узьнікненьне курганных могільнікаў на р.Зяльвянка каля вёсак Пацавічы і Дзенькаўцы.

***Сярэдзіна І тысячагоддзя да н. э. -*** існаваньне стаянкі на беразе р. Шчара каля в. Каралі.

***11-14 ст.*** - існаваньне гарадзішчаў на беразе р. Шчара каля в. Маскалі і Навасёлкі; на мысе пры зьліцьці рэк Нёмана і Шчары; на левым беразе р. Нёман каля в. Глядавічы.

***12-15 ст.*** - існаваньне Гарадзенскага княства, у склад якога ўваходзіла заходняя частка Мастоўшчыны.

***13 ст.*** - існаваньне Ваўкавыскага княства, куды ўваходзіла паўднёвая частка Мастоўшчыны, а ўсходняя частка – у Слонімскае княства.

***1-я палова 13 ст.*** - уваходжаньне Мастоўшчыны ў склад Вялікага княства Літоўскага.

***Матэрыял падрыхтавала пані ЛЯЛЯ***
***з выкарыстаньнем матэрыялаў кніг***
***“Памяць”***
***Г.Г. Касьяновича «На берегах Немана»***

## ПАРАЎНАЙ СВОЙ ЗАРОБАК

Паводле інфармацыі зьмешчанай на партале TUT.BY (згодна з дакладам ад 2004/03/23 Фэдэрацыі эўрапейскіх працадаўцаў, незалежнай арганізацыі, створанай у 1989 г. па ініцыятыве Эўрапейскай камісіі) самы высокі заробак існуе ў Даніі, ён узяты за 100%.

У першай дзясятцы - Швайцарыя (79%), Люксэмбург (72%), Нарвэгія (69%), Нямеччына (63%), Нідэрлянды (61%), востраў Мэн (Вялікая Брытанія) і Італія (па 60%), Вялікая Брытанія (58%) і Фарэрскія выспы (Данія, 56%). У дакуманце былі прааналізаваныя дадзеныя па 46- х краінах Эўропы. У абсалютных лічбах у сярэднім гадзіна працы ў Даніі каштуе 27,89 эўра, а ў Малдове 0,32 эўра.

Беларусь у гэтым сьпісе на перадапошнім мейсцы, абагнаўшы толькі Малдову.У 2003 годзе самыя вялікія тэмпы росту заробку назіраліся ў Славакіі (+11,3%), Эстоніі (+9,8%) ды Латвіі (+9,6%).

***Паводле TUT.BY***

## Зварот Івонкі Сурвілы - прэзыдэнта БНР

*Дарагія Суродзічы!*

Ад імя Рады Беларускай Народнай Рэспублікі вітаю Вас з нашым слаўным Днём Волі 25-м сакавіком. Днём, калі наш народ абвесьціў сьвету ў 1918 годзе, пасьля доўгіх гадоў зьняволеньня, што ён жыве, што жадае мець сваю ўласную незалежную дзяржаву, што хоча заняць пачэснае месца між іншымі народамі сьвету.

Падчас доўгіх гадоў бальшавіцкае ўлады, калі Масква і яе калябаранты ў Менску стараліся ўсякімі спосабамі сьцерці гэты дзень з нашае памяці, ён быў для беларусаў тым “агеньчыкам”, той надзеяй, аб якой наш дарагі Васіль Быкаў гаварыў на сваім апошнім сьвяткаваньні 25-га сакавіка, год таму ў Празе.

Дык адзначым гэты дзень зь любоўю да свае Бацькаўшчыны, з гордасьцю за сваю спадчыну, за сваю гісторыю, за сваіх продкаў, якія аддана і адважна баранілі сваю зямлю ад захопнікаў, і з радасьцю бо мы ўсё-ж перамаглі!

Аднак край наш яшчэ ня ёсьць такім, якім мы яго жадаем. Цяжкія ўмовы жыцьця, непавага да людзкіх правоў і да нашай мовы і культуры, пагроза незалежнасьці нашай дзяржавы яшчэ ўсё турбуюць жыцьцё нашага народу.

Але-ж ёсьць у нас дзяржава! І Заходні сьвет ніколі так не спрыяў незалежнасьці Беларусі і дэмакратычнаму ладу жыцьця ў нашай краіне,як цяпер.

І цяпер ад нас самых залежыць, ці мы выкарыстаем гэтыя спрыяльныя палітычныя ўмовы і ці зойме нашая дзяржава пачэснае мейсца між іншымі народамі сьвету, ці не.

Нашым сьвятым абавязкам ёсьць ня толькі абараніць здабытае, але і адбудаваць наш край. Гэта мусіць быць мэта кожнага беларуса, пакуль наш край ня станецца нармальнай эўрапейскай дэмакратыяй, а ўрад наш не пачне працаваць на карысьць Беларусі, а ня штучнай толькі яму выгаднай ідэалёгіі.

**Дык памажы нам Божа!**
**Жыве Беларусь!**
***Івонка Сурвіла***
***Старшыня Рады Беларускай Народай Рэспублікі***

## Абаронца Айчыны

# Кастусь Каліноўскі

***22 сакавіка 1864 года ў Вільні, на гандлёвай плошчы Лукішкі, быў публічна пакараны сьмерцю Кастусь Каліноўскі. Яму было толькі 26 год. Ён пражыў нядоўгае жыццё. Але ж назаўсёды застаўся для нас яскравым прыкладам чалавека, які змагаўся і аддаў жыццё за Незалежнасьць сваёй Радзімы і дабрабыт Беларускага народа.***

З таго часу прайшло 140 год. Але ж і сёньня асоба Кастуся Каліноўскага натхняе нас, маладых людзей ісьці наперад і дамагацца пераменаў у нашай дзяржаве. Бо хто зробіць за нас, як ня мы самыя?
Пасьля атрыманьня юрыдычнай адукацыі ў Пецярбургу Кастусь Каліноўскі вяртаецца на Радзіму ў Беларусь і, не ўступаючы ні ў якія палітычныя арганізацыі, ідзе ад вёскі да вёскі і тлумачыць беларускаму селяніну, што толькі ён сам, Беларускі народ, здольны вызваліць сваю краіну ад галечы і акупацыі. Далей ён стварае канспэратыўную арганізацыю якая заклікала студэнтаў ехаць працаваць ў вёску настаўнікамі і пісарамі, каб маладыя і адукаваныя людзі тлумачылі “цёмнаму” сялянству ідэі незалежнасьці і дэмакратыі.
Славуты рэвалюцыянэр дэмакрат, публіцыст і паэт, ён выявіў несумненны талент палітыка і арганізатара, імкнучыся аб'ядналь сялянскі антыпамешчыцкі рух з нацыянальна вызваленчым рухам. Вуснамі Каліноўскага гаварыла сама паняволеная Беларусь. Гаварыла годна і патрабавальна. Бо ён зьвяртаўся да фундамэнтальных каштоўнасьцяў чалавечага жыцьця , мужна шукаў грамадзкую праўду, выказваў упэўненасьць у лепшай будучыні роднага народа. За шчасьце Беларусаў змагар аддаў сваё маладое жыццё. І таму застаўся несьмяротным.
Са сваімі паплечнікамі Каліноўскі стварыў і выдаваў газэту “Мужыцкая праўда” якая абуджала сьвядомасьць беларусаў і заклікала іх да паўстаньня. Ён заклікаў жыць з усімі суседзямі і народамі ў сяброўстве і згодзе, каб ніколі не было над Беларусамі, над родным краем ніякага прымусу й няволі.
Кастусь Каліноўскі па геройску кіраваў паўстаньнем 1863 года. А пасьля таго, як паўстаньне было патоплена ў крыві Расейскім губернатарам Мураўёвым-вешальнікам, каля поўгоду хаваўся ад царскага зыску. Усё ж такі яго арыштавалі і за кратамі ён напісаў - **“Ліст з пад шыбеніцы.”**



“ Браты мае, мужыкі родныя, горка пакінуць зямельку родную і цябе, дарагі мой народзе! Грудзі застогнуць, забаліць сэрца, але ня жаль загінуць за тваю праўду. Прымі, народзе, шчырасьці слова маё прадсьмертнае... Ваюй, народзе, за сваё чалавечае і народнае права, за сваю веру, за зямлю сваю родную”.
Сёньня гісторыкі нязьменна называюць Каліноўскага ў шэрагу самых выдатных дзеячаў беларускага АДРАДЖЭНЬНЯ Х1Х пачатку ХХ стагоддзя. **Ён - наш вялікі нацыянальны герой!!!**
Любоў да гераічнай, узнёслай, рамантычнай асобы Кастуся Каліноўскага ня згасне ніколі.

***З. К.***

## Крыжаванка

*__Па вертыкалі:__*1.У Аўтамабіле.
2.На сцэнах.3.Мэры Попенс 5.Н2О
7.Дзень тыдня.8.”Пойла для лахоў”.
9.Біцца як ... аб лёд.10.Лапа цюленя.
*__Па гарызанталі:__*1.Ямка ў адзеньні.
2.Гаварыць ціха (наз.).6.Белая гліна.
7.№11.Галоўны ... Будынка.
12.Прымета розуму.13.Сталовы прыбор.

*Склала Алена К.*



# ЖАР ЖАРЦІКі

***Ёсьць дзьве самыя старажытныя прафэсіі.
Другая - палітыка.
Яе падабенства з першай не выклікае сумневу!***

***Р.Рэйган .***

Ваявода кажа князю:
-Вялікі князь! Прыйшлі татары ...
Мзду патрабуюць.
- Мзду!? Пішы мой загад ... Даць татарам мзды!...

***Пірамiды пабудавалі не рабы, а грамадзяне, якія хадзілі на суботнікі....***

Адзін хлопец пытае ў другога:
- Ты любіш поўных жанчын?
- Поўных чаго?

***Абвестка на слупу:
Рамантуем дахі і чардакі з матэрыялаў заказчыка.
Брыгада ўрачоў-псыхатэрапэўтаў.***

Тэлефанаваньне ў пажарную частку:
- Аллё! Гэта пажарныя?
- Так.
- Тут урач з міліцыянтам дзяруцца - я нешта і ня ведаю, куды патэлефанаваць...

Мова выданьня беларуская, рэдакцыйны правапіс клясычны (паводле граматыкі Браніслава Тарашкевіча), матэрыялы таксама могуць друкавацца з выкарыстаньнем іншых граматык беларускай мовы, па жаданьню аўтараў, але пры строгай рэглямэнтацыі рэдакцыйнай калегіі.
Усе матэрыялы праходзяць жорсткую рэдакцыйную цэнзуру на адпаведнасьць ідэалягічнай сістэме беларускай дзяржавы. Аўтары матэрыялаў ня могуць ня несьці адказнасьць за свае матэрыялы.

Кантакт:
e-mail:paniamonnie@tut.by

*Надрукавана ў друкарні “Відродження“, вул. Лесі Ўкраінкі 22, Львоў, Украіна
Замова № 1918*

**Рэдактар: Зьміцер Кухлей**

**Наклад: *299 ас.***